регатов от 2,5 до 12 метров создает наилучшие предпосылки для их э
номически эффективного использования в предприятиях всех типов. О
ем бункера от 650 до 12.200 литров обеспечивает оптимальную произ
дительность каждой отдельной машины. В распоряжении фермеров ме
ническая рядовая сеялка Сапфир, пневматическая рядовая сеялка Солит
комбинация Компакт-Солитер.

Помимо вышеуказанных типов сельскохозяйственной техники, Lemk
производит *культиваторы*, *глубокорыхлители*, *дисковые бороны*,
весные и прицепные опрыскиватели и другое оборудование для эффект
ного ведения сельского хозяйства.

1. http://lemken.com/ru/novosti-i-pressa/press-reliz/podrobnyi-press-reliz/article/karat-jetzt-leichter-unterwegs/

*УДК 811.161.3*

## ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ

*Я.С. Касмовіч - студэнтка 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык І.С. Фокіна*

Любая творчасць – акт самаздзяйснення. Калі праз творчасць раскр
ваецца чалавек таленавіты, з боскім дарам, і такая самарэалізац
становіцца сэнсам жыцця – гэта ўжо ўласныя набыткі не толькі яго, а
іншых людзей. Твор можа застацца невядомым, народжаны адзінкав
усплёскам унутранай энергіі творцы, а можа набыць доўгае жыццё, ка
прасякнуты высокай духоўнай энергетыкай асобы аўтара. Творчасць
арэна самасцвярджэння, дыханне, без якога няма жыцця. Менавіта так
паэтэсай з боскай іскрай, якой дадзена было тварыць як дыхаць і чые кні
– наш мастацкі набытак, была і ёсць для нас Яўгенія Янішчыц.

"Палеская ластаўка", "Палесся мілае дзіця", "палеская летуценніца"
так назвалі ў нашай літаратуры гэтую выдатную паэтку, якой, на вялі
жаль, было суджана пражыць усяго сорак гадоў.

Яўгенія Янішчыц нагадвае казачную птушку ў вечным палёце, як
праляцела над родным Палессем, над Беларуссю, лёгкім крыло
ускалыхнула аблокі, імкліва і нечакана растаяла за небасхілам ("Ластаў
палеская, навошта // Гэтак рана адляцела ты?" – Г. Бураўкін). Схавалася
далечыні, але не знікла, пакінула прыкметны след у літаратуры ("Ды буд
вечна блізкім рэхам // Звінець твой голас малады". – С. Грахоўскі).

Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года ў вёсц
Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў простай сялянскай сям'і, а 2
лістапада 1988 года жыццё паэткі трагічна абарвалася.

Яўгенія Янішчыц з'яўляецца яркай і таленавітай прадаўжальніцай традыцый нацыянальнай паэзіі – найперш традыцый духоўнасці і лірызму, якія звязаны з выяўленнем любові да роднага краю, філасофіі народнага побыту, еднасці чалавека і прыроды. Я. Янішчыц – песнярка Палесся, "вобразаў мілых роднага краю" ( Якуб Колас), вясковага жыцця, сялянскай працы.

Для мяне, як і для чытачоў, Я. Янішчыц засталася шчымлівай лірычнай паэтэсай, якой дадзена было словам кранаць сэрцы, узвышаць перажыванні і ачышчаць душы.

Ранняя паэзія Яўгеніі Янішчыц – рэалістычна-зямная, напоўненая жыццёвай канкрэтыкай. Сама прырода падказвала ёй вобразы і паэтычныя радкі. Навакольныя краявіды, мяккая і ціхая палеская прырода, думаецца, фарміравалі светаадчуванне Яўгеніі Янішчыц, якая выявіла сябе як пранікнёны лірык слова.

У ранніх вершах Яўгеніі Янішчыц прываблівоюць шчырасць, нязмушанасць, натуральнасць паэтычных уражанняў, захапленне хараством жыцця, радаснае ўсведамленне ўласнай прысутнасці ў вялізным, неабсяжным свеце.

Першы зборнік вершаў маладой паэткі "Снежныя грамніцы" выйшаў, калі яна вучылася на пятым курсе БДУ. Значнае месца на самым пачатку лірычнай споведзі займае вёска, простыя вяскоўцы (суседзі, сваякі, часам проста знаёмыя), Бацькаўшчына, родная зямля. Менавіта з першай кнігі выявілася ў Яўгеніі Янішчыц усеабдымная любоў да палескай зямлі, роднай вёскі, бацькоў і аднавяскоўцаў, якая стала вызначальнай рысай усёй яе паэзіі.

Пра лірыку Яўгеніі Янішчыц гаварыць няпроста, бо кожны радок і кожны верш настолькі арганічна зніταваны, што амаль немагчыма вылучыць нешта для аналізу, каб не парушыць цэласнасць светаўспрымання.

У жаночай існасці Яўгеніі Янішчыц быў закладзены глыбінны гуманістычны пачатак: дабрыня, шкадаванне, чуласць, міласэрнасць, спагада...

Вельмі прыемна расказваць вам пра такую цудоўную паэтэсу, як Яўгенія Янішчыц: яе лёс, творчасць, жыццё. Ганаруся яе талентам, той творчасцю, вяліім дарам, якія напоўнілі наша жыццё цудоўнай беларускай літаратурай. Таму я вырашыла пасвяціць ёй свой верш:

Я табой ганаруся так моцна:
Гэтым талентам, шчырасцю слоў,
Што душу закранаюць бязконца
Нібы спеў, што да сэрца ляцеў.

Ты прывабіла гэтым натхненнем
І любоўю да роднай зямлі,
Гэтай ласкай, пясчотай сардэчнай,
Што ў душы адчуваем усе мы.

Я цябе не забуду ніколі,
Буду доўга і моцна любіць,
Бо такую птушку Палесся
Не змагу я ніколі забыць.

*УДК 811.161.3*

# ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ ПРА ПРАЦУ Ў БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ

*А.Б. Яхімовіч – студэнтка 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Г.А.Смалянка*

Гістарычна велізарную частку жыцця нашых продкаў займае праца. Ды і для сучаснага чалавека праца незвычайна важная. Так што ёмістыя і выразныя прыказкі аб працы не губляюць сваёй мудрай актуальнасці. У іх выказана глыбіня жыццёвага народнага вопыту і выказаны павучальныя назіранні, якія дэманструюць важнасць працы. Мноства прыказак ў лаканічна-гуллівай форме не толькі сцвярджаюць важнасць працы, але і заклікаюць паважаць працоўных, шанаваць чужыя намаганні.

Пры даследаванні рускіх і беларускіх прыказак пра крыніцы набыцця было выяўлена, што несумненнай каштоўнасцю для прадстаўнікоў гэтых этнасаў з'яўляецца ўласная працоўная дзейнасць: уласная праца выступае як аснова жыцця і залог дабрабыту. Тады як выкарыстанне вынікаў чужой працы атрымлівае відавочна негатыўную ацэнку.

Праца ў прыказкавых выразах, якія апісваюць крыніцы набыцця за кошт уласнай працы, знаходзіць адлюстраванне ў паняццях:

а) рамяство:

У ремесла не без промысла.

Ремесло пить-есть не просит, а хлеб приносит.

З рамяством дружыць – у жыцці не тужыць.

Рамясло піць-есці не просіць,а само корміць.

Варта заўважыць, што у большасці як рускіх, так і беларускіх народаў рамяство каваля ацэньваецца як тое, што прыносіць прыбытак:

Кузнецу, что козлу - везде огород.

У кавалей рукі ў золацу.

Каваль куе,кваліха пяе.

Таксама звяртаецца ўвага на фактары, якія аказваюць непасрэдны ўплыў на прафесійныя ўменні, навыкі людзей. Так, напрыклад, пазбавіцца свайго майстэрства чалавек можа пад уздзеяннем згубнай прыхільнасці да спіртнога, пра што сведчаць наступныя выразы: